Малахава А.С., студ. гр. 313 ФТБК і СМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Васюк Т.І., дацэнт

# МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ СТВАРЭННЯ АБ’ЁМНАЙ ДЭКАРАТЫЎНАЙ ПЛАСТЫКІ Ў КЕРАМІКЕ

На тэрыторыі Беларусі, як і на землях суседніх усходнеславянскіх народаў, апрацоўка гліны вядома з эпохі неаліту (IV—III тысячагоддзі да н. э.), калі з'явіліся першыя вылепленыя ўручную сасуды для гатавання ежы. На працягу стагоддзяў гэта рамяство прайшло складаны эвалюцыйны шлях, з’яўляючыся неад’емнай часткай народнай культуры.

Значная частка мастацкіх выразных сродкаў закладзена ў матэр’яле. Гліна, асноўная сыравіна ў ганчарнай вытворчасці, мае пэўную колькасць каштоўных якасцяў. Яна размакае у вадзе, пластычная ў вільготным стане, захоўвае форму пры высыханні, пасля абпалу набывае даволі высокую механічную трываласць і воданепранікальнасць, тэрмічную ўстойлівасць.У межах Беларусі выяўлена каля 400 радовішчаў гліны. Большасць беларускіх ганчарных глін належыць да ліку лёгкаплаўкіх, галоўным чынам азёрна-ледавіковага паходжання. Пераважна яны распаўсюджаны на поўначы і ў сярэдняй частцы краіны[1,с.8].

Беларускія гліны маюць чырвона-буры, буры, карычневы, цемна-карычневы колер, на Заходнім Палессі сустракаюцца зоны залягання светлых каалінавых глін. Пасля абпалу з доступам кісларода набываюць разнастайны па тону вохрысты колер, пасля бескіслароднага абпалу – цёмна-шэры, чорны.

Акрамя самобытнай мастацкай каштоўнасці матэр’ялу кераміка як від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мае багатую палітру выразных сродкаў.

Аб’ёмна-прасторавая дэкаратыўная пластыка шырока сустракаецца у афармленні інтэр’ераў як грамадскіх устаноў, так і жылых памяшканняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мастацтва керамікі займае значнае месца ў сучаснай культуры. Рэгулярна праходзяць творчыя выставы, конкурсы, пленэры, у якіх прымаюць удзел сталыя мастакі і студенты. Працуе Барысаўскі камбінат дэкаратыўна- прыкладнога мастацтва імя А.М.Кішчанка. Беларуская кераміка развіваецца на падмурку традыцый, захоўваючы лепшае і набываючы новыя рысы.

На пачатку трэба засяродзіць увагу на найбольш архаічным спосабе стварэння аб'емнай формы, вядомым з часоў неаліту, калі чалавек засвойваў першыя прыёмы апрацоўкі гліны. Сутнасць дадзенага спосабу – набор формы шляхам паслядоўнага прымацавання гліняных шнуроў ці пластоў адзін да аднаго. Пласты і жгуты утвараюць своеасаблівую фактуру на паверхні вырабу, пакідаючы амаль неабмежаваны прастор для творчасці.

Асаблівасці папярэдняй сушкі і абпалу керамікі патрабуюць абмежаванняў па таўшчыні глінянага аб'ёма, якая не павінна перавышаць пэўныя паказчыкі. Дзеля гэтага усе вялікія па памерах формы робяць полымі. Гэтага можна дасягнуць некалькімі спосабамі: сфарміраваць аб'ём і пасля выбраць знутры лішнюю гліняную масу ці ўтварыць тую ж форму з пласта. Апошні спосаб мае шэраг пераваг, бо дазваляе больш дакладна вызначыць таўшчыню сценак і нанесці на паверхню твора фактуры, што зручней рабіць на плоскасці.

Яшчэ адзін цікавы метад – набіўка глінянай масы ў форму, якая звычайна адліваецца з гіпсу. У дадзеным выпадку неабходна прайсці праз шэраг падрыхтоўчых этапаў. Спачатку выконваецца мадэль аб'екта у натуральны памер, з якой потым адліваюць гіпсавую форму, на падставе якой у сваю чаргу можна зрабіць значную колькасць твораў, ідэнтычных па сваіх памерах. Гэты метад вельмі зручны, калі патрабуецца шматразова паўтарыць пэўны аб'ект.

Знакавым прыкладам выкарыстання гэтай методыкі ў гісторыі керамікі з'яўляецца вытворчасць кафлі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У дадатак мы атрымлівем магчымасць ствараць характэрны малюнак паверхні аб’екта, які атрымоўваецца пры запаўненні гіпсавай формы глінянай масай. Пласты, шнуры, дробныя кавалачкі надаюць паверхні характэрную фактуру.

Стварэнне аб’емнай пластыкі на ганчарнай аснове бярэ пачатак у вытворчасці  посуду з дапамогай ганчарнага кола. Усе формы, зробленыя такім чынам, маюць агульную рысу – радыюснасць. Гэта звычайна адлюстравана і ў дэкоры аб’ектаў. Выкарыстоуваюць цэльныя выработленыя на ганчарным коле формы і іх часткі. І першыя, і другія ў вільготным стане паддаюцца дэфармацыі, утвараючы высокапластычныя абрысы твора.

Існуе вялікая колькасць метадаў і прыёмаў дэкаратыўнай апрацоўкі твораў.

Гліна з’яуляецца самабытным матэр’ялам і таму не патрабуе абавязковага дадатковага дэкарыравання. Абпаленая без пакрыцця палівамі ці ангобам, дымлення, абвары і іншага  кераміка называецца тэракота. Колер яе мае шырокі дыяпазон у залежнасці ад хімічнага складу глінянай масы і тэмпературы абпалу.

Шамаціраваная гліна (з дадаткам размельчанай абпаленай гліны) набывае жывую шурпатую фактуру.

Цікавы эфект дае выкарыстанне арганічных дамешкаў (апілак, крупы і г.д.), якія выгараюць  у час абпалу, пакідаючы пустоты.

Каляровыя гліняныя масы ствараюць дадатковую выразнасць твораў, захоўваючы пры тым натуральную фактуру паверхні.

Ажур дазваляеператварыць творы з такога плотнага і цяжкага матэр’ялу, як гліна, у лёгкія, напоўненыя паветрам формы. Дасягнуць гэтага эфекту можна некалькімі спосабамі: скваным прарэзваннем па гатовай форме ці па пласту або шляхам перакрыжаванняў пластоў ці шнуроў.

Выкарыстоўваючы рэльеф, на паверхні аб’ёмнай формы можна выканаць як геаметрычныя матывы, так і складаныя сюжэтныя кампазіцыі. Характар дэкору будзе залежыць ад дыяпазону высаты рэльефу. Асобна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трэба адзначыць выявы, утвораныя адбіткамі раслін ці іншых формаў. Гэты прыём вядомы як манатыпія.Ён дазваляе перанесці на твор прыгажосць і гарманічнасць прыродных ліній.

Выкарыстоўваюцца і другародныя матэр’ялы.Аплятанне шнурам, інкрустацыя барэстай, металічныя і драўляныя канструкцыі выкарыстоўваюцца на завяршальным этапе, калі гатовыя творы злучаюцца ў цэльную кампазіцыю.

Кераміка “раку” - адна з найбольш незвычайных тэхналогій, калі гатовы абпалены твор разбіваюць на некалькі кавалкаў і кожны дэкарыруюць асобна ( дымленнем, абварай, палівамі, ангобам і г.д.), а пасля зноў сабіраюць у цэлую форму.

Дэкратыўная апрацоўка паверхні на аснове традыцыйных тэхналогій керамікі – гэта прыёмы, найбольш цесна звязаныя з народным мастацтвам.

Гартаванне(абвара) - адзін са старажытнейшых спосабаў апрацоўкі керамічных вырабаў. Распалены дачырвана посуд вымалі з печы ці горна драўлянымі клешчамі і апускалі ў мучную рошчыну, “абвару”. Посуд набываў своеасаблівы “рабы” дэкор у выглядзе цёмных плямін. Пасля такой апрацоўкі гліняны чарапок “загартоўваўся”, рабіўся больш моцным [1, с.95].

Характэрны выгляд мае задымленая кераміка. Распаліўшы посуд дабяла, у горан падкідвалі смалякі і наглуха яго зачынялі. Пры гарэнні без доступу паветра ў выніку пэўных хімічных рэакцый паміж чадным газам( вокісам вугляроду) і солямі жалеза, якія ёсць у гліне, вырабы набывалі матавы чорны ці сіняваты колер.

Разнавіднасцю задымленай керамікі з’яўляецца чорнаглянцаваная. Перад абпалам ганчар каменчыкам ці косткай наносіў на паверхню посуду ўзор: вертыкальныя і касыя палоскі, сетку, елачкі і інш. Пасля абпалу яны рабіліся бліскучымі, выразна выглядаючы на матавым фоне.

Пры глазураванні посуд пакрывалі тонкім слоем шклопадобнай масы, вядомай як паліва. Ў яе склад уваходзіў свінец, перапалены да пераходу ў вокісь. Часцей за ўсё выкарыстоўвалі празрыстую бясколерную паліву. Але

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўжывалі і каляровую, дадаючы ў якасці фарбавальнікаў перапаленую медзь (зялёны), вокіс марганца (бурштын) і інш. З-за дарагавізны спосабу посуд часта глазуравалі толькі з унутранага боку і звонку па верхняй частцы [2, с.58].

Пад празрыстую паліву на плечыкі сасудаў на дно і сценкі талерак і місак вадка разведзенай глінай іншага колеру (ангобам) наносілі паяскі, зігзагі, разеткі. Адным з найбольш выразных відаў роспісу з’яўляецца фляндроўка.

Гравіраваны дэкор у выглядзе рысак, хваляк, паяскоў, штампаў наносіўся па сырой паверхні вырабу, утвараючы рэльефны ўзор.

Часам каб надаці посуду большую траваласць, яго апляталі дротам або бяростай.

Таким чынам, у сучасным жыцці кераміка страціла сваю бытавую функцыю, але паустала у новай ролі як своеасаблівы, выразны, заснаваны на каштотўных здабытках майстроў мінулага від декаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яна развіваецца, успрымаючы новыя плыні ў культуры, але пры тым не страчвае глыбіні, уласцівай мастацтву, якое бярэ свой пачатак у глыбокай старажытнасці.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Милюченков, С.А. “Белорускoе народное гончарство”, Мінск: Навука і тэхніка,1984. – 183с.

2. Сахута, Я. М. “Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”,2-ое выд.перапрац.з дап. –Мінск: Беларусь, 2001.- 110с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ